і ўзроўню падрыхтоўкі студэнтаў па эканамічнай тэорыі. Студэнт, завяршыўшы вывучэнне гэтага курса, павінен паказаць веданне асноў эканамічнай тэорыі, разуменне сітуацый на мікра- і макраўзроўні, асабліва сітуацый, якія звязаны з інфляцыяй, уздымам, спадам вытворчасці, разуменне сутнасці ўрадавых рашэнняў у галіне сацыяльна-эканамічнай палітыкі, уменне арыентавацца ў бягучых эканамічных пытаннях, валодаць ведамі аб асноўных прадстаўніках сусветнай і айчыннай эканамічнай думкі.

Другая праблема заключаецца ва ўліку профілю навучальнай установы ў выкладанні дысцыпліны.

Сёння ў Беларускім універсітэце культуры існуе праграма курса "Эканамічная тэорыя і эканоміка культуры",якая прадугледжвае двухузроўневую эканамічную падрыхтоўку студэнтаў. Пасля вывучэння асноў эканамічнай тэорыі студэнтам выкладаецца курс, у якім разглядаецца эканамічны механізм функцыяніравання ў галіне культуры.

На жаль, гэта ініцыятыва, падтрыманая ва універсітэце на ўсіх узроўнях, мела негатыўныя вынікі для выкладання ўласна эканамічнай тэорыі, паколькі на новы курс па эканоміцы культуры не было выдзелена ніводнай гадзіны.Пры поўнай адсутнасці падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў па курсу выкананне вышэй адзначаных патрабаванняў да эканамічнай падрыхтоўкі студэнтаў нерэальна.

Пры ўсім тым нельга сказаць, што дэканаты факультэтаў і загадчыкі спецыяльных кафедраў не ўсведамляюць неабходнасці эканамічнай адукацыі спецыялістаў сферы культуры. Адкрыццё спецыяльнасці "мэнеджэр сацыяльна-культурнай сферы", выкладанне бібліятэчнага маркетынгу і іншых эканамічных курсаў сведчаць аб разуменні такой неабходнасці. Аднак пры адсутнасці каардынацыі выкладання эканамічных дысцыплін цалкам быў парушаны прынцып паслядоўнасці і пераемнасці іх вывучэння. Паралельнае выкладанне эканамічнай тэорыі і спецыяльных эканамічных курсаў, тым больш выкладанне шэрагу эканамічных дысцыплін да таго, як студэнты атрымаюць асновы эканамічных ведаў, з'яўляецца сведчаннем непрафесійнага падыходу да ўдасканальвання эканамічнай адукацыі.

Перад выкладчыкамі эканамічных дысцыплін стаяць і іншыя неадкладныя праблемы. Эканамічнай навуцы яшчэ трэба будзе заняць сваё дастойнае месца ў абноўленай вышэйшай школе.

Елісеева Г.М.,
выкладчык

## "САЦЫЯЛОГІЯ КУЛЬТУРЫ" Ў СІСТЭМЕ ПАДРЫХТОЎКІ СПЕЦЫЯЛІСТА

Перамены, якія адбыліся ў XX стагоддзі, дазволілі паставіць пытанне аб новых падыходах да разумення сацыялагічных ведаў. У такой сітуацыі ўзнікае пытанне: што павінна даць сацыялогія студэнту, які займецца ў ВНУ? Адказ можа быць такім: арыентацыю ў складаным сучасным грамадстве, закончаную сістэму ведаў і трывалых ісцін.

Але, на жаль, сацыялогія ўсё яшчэ працягвае заставацца ў стадыі "станаўлення". Сёння яна толькі прапануецца і ў вучэбныя планы ўводзіцца па жаданні кіраўніцтва ВНУ, г.зн. не ўключаецца пакуль у лік абавязковых дысцыплін. Тут выяўляецца агульнае падзенне прэстыжу грамадскіх навук, адсутнасць падручнікаў, недастатковасць вопыту. Таму разлічваць на закончаную сістэму ведаў студэнтаў пакуль яшчэ не прыходзіцца.

Калі мы хочам, каб сацыялогія "прыжылася" ў ВНУ, то павінны ў першую чаргу паклапаціцца аб прывабнасці яе для студэнтаў і кіраўнікоў навучальных устаноў.

Як гэтага дасягнуць?

Сацыялогія ёсць шырокая сацыялагічная тэорыя, якая вывучае грамадства ў цэлым. Для вывучэння ў ВНУ з сацыялагічнай навукі неабходна адабраць такія тэмы, якія дазволяць студэнтам больш умела рашаць свае прафесійныя і агульначалавечыя праблемы, улічваць спецыфіку ВНУ, сувязь сацыялогіі з іншымі дысцыплінамі.

Выкладанне сацыялогіі культуры ў нашым ВНУ патрабуе асобнага міжпрадметнага кантакту, таму што побач з сацыялогіяй культуры выкладаюцца такія дысцыпліны, як тэорыя культуры, культуралогія, эканоміка культуры і іншыя, цесна звязаныя з катэгорыяй "культура". Сацыялогія культуры - галіновая сацыялагічная тэорыя, якая вывучае заканамернасці функцыяніравання культуры ў грамадстве, распаўсюджванне, захоўванне і спажыванне культурных каштоўнасцей. Займаецца гэта навука таксама прагназіраваннем развіцця культуры. Культуралогія ж і тэорыя культуры разглядаюць пытанні

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аб генэзісе, сутнасці і вытоках развіцця, гістарычных тыпах культуры і іншыя праблемы. У цэнтры ўвагі сацыялогіі культуры як прадмета знаходзяцца сацыяльныя аспекты функцыяніравання культуры ў грамадстве і ў канкрэтным сацыяльным асяроддзі.

На наш погляд, важным тут з'яўляецца цесны кантакт кафедр названых дысцыплін, каб не было паўтору ў выкладанні і кожная навука несла веды для студэнтаў, якія адпавядалі б профілю кафедры.

Задача сацыялогіі культуры - паказаць месца і ролю культуры ў грамадскай сістэме, культурную дзейнасць і культурны ўзровень тых або іншых сацыяльных і сацыяльна-дэмаграфічных груп, стан і функцыяніраванне сацыяльных інстытутаў і ўстаноў культуры як у галіне вытворчасці, так і галіне спажывання культуры.

Галоўным з'яўляецца раскрыць на канкрэтных сацыялагічных даследаваннях ролю і ўздзеянне культуры на ўсе сферы грамадскага жыцця.

Жарыкава А.А.,
канд.філас.навук,
выкладчык

## НЕКАТОРЫЯ НАПРАМКІ ПАВЫШЭННЯ ПРАФЕСІЯНАЛІЗМУ ВЫКЛАДЧЫКАЎ

Ва ўмовах пераходу да рыначных адносін рэзка ўзрастае неабходнасць удасканальвання сістэмы адукацыі ўсіх узроўняў. Сёння патрабуецца такая адукацыя, якая дасць магчымасць усебаковага ўключэння ў духоўнае і культурнае жыццё рэспублікі, вызначэння свайго месца ў палітычным, сацыяльным і працоўным жыцці ў адпаведнасці з уласнымі магчымасцямі і здольнасцямі.

Такая універсальная падрыхтоўка спецыяліста патрабуе і універсальнага выкладчыка, выкладчыка з высокім узроўнем развіцця светапогляду і культуры, здольнага арыентавацца ў канкрэтнай сацыяльнай сітуацыі, спасцігнуць унутраны свет сваіх студэнтаў, ацаніць іх магчымасці і схільнасці, індывідуальна паставіцца да навучання, развіцця асобы кожнага.

Як сёння дасягнуць гэтага? Тая практыка, калі выкладчык раз у пяць гадоў павышае сваю кваліфікацыю, не поўнасцю адпавядае сучасным патрабаванням. Сёння ў аснове адукацыйнай палітыкі ўсіх без выключэння развітых краін, ляжыць канцэпцыя бесперапыннай адукацыі.

Што прадугледжвае канцэпцыя бесперапыннай адукацыі?

Перыяд навучання не абмяжоўваецца пэўнымі ўзроставымі рамкамі, а працягваецца ўсё жыццё. Абвяргаецца сцвярджэнне, што толькі арганізаваная сістэма адукацыі з'яўляецца сродкам ведаў. Галоўнае, на чым акцэнтуецца ўвага, - гэта самаадукацыя. Сёння формула адукаванасці вызначаецца не колькасцю ведаў, а метадалагічнай падрыхтоўкай, пазнаннем агульных заканамернасцей, уменнем арыентавацца ў складаным і вялікім патоку інфармацыі.

У сувязі з гэтым ў новых ўмовах з'яўляецца неабходнасць вызначэння аптымальнага ўзроўню вучэбнай нагрузкі. Гэта створыць належныя ўмовы для ўсебаковага, інтэлектуальна насычанага ўдзелу прафесарска-выкладчыцкага саставу ў навуковых даследаваннях, у культурным і сацыяльным жыцці грамадства, вызваліць такі неабходны час для самаадукацыі.

Але каб сістэма бесперапыннай адукацыі дзейнічала, патрэбны на дзяржаўным ўзроўні комплексныя філасофскія, сацыяльна-псіхалагічныя і сацыяльна-эканамічныя даследаванні, мэтанакіраваная дзейнасць дзяржавы, у аснове якой знаходзіліся б прынцыпы доўгатэрміновай палітыкі ў адносінах да адукацыі, навукі,культуры. І рабіць гэта патрэбна неадкладна з мэтай прыпыніць развіццё інтэлектуальнага крызісу, бо ўжо сёння ідзе адток выкладчыцкіх кадраў з адукацыйнай сферы ў камерцыйную.

Высокі прафесіяналізм мае на ўвазе не толькі прафесійную кампетэнтнасць, але і пачуццё новага, ініцыятыўнасць, валоданне культурай працы, прафесійнай этыкай і маральнасцю. І ў гэтым накірунку вельмі важна ўсведамленне неабходнасці развіваць нацыянальную культуру, берагчы спадчыну на аснове асэнсавання характару развіцця беларускай нацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ